View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

УДК 82(091)

# ФЕНОМЕН САМОТНАГА ЧАЛАВЕКА ПРАЗ ПРЫЗМУ ПРЫТЧАВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***Вольга Жылевіч***
*Пінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаецца спецыфіка феномена самотнага чалавека ў сучаснай прытчавай літаратуры. Звяртаецца ўвага на асаблівасці інтэрпрэтацыі феномену ў творах Т. Бондар «Павуцінне» і М. Турнье «Элеазар, альбо Крыніца і Куст».

***Ключавыя словы: феномен, самота, прытчавая літаратура, раман-прытча, фенаменалогія, экзістэнцыялізм, рэлігія***

У цяперашні час чалавечае жыццё аказваецца ў прамежку паміж рознымі сустрэчнымі і перасякальнымі сэнсавымі крывымі. Грамадства перыяду канца XX – пачатку XXI стст. дасягае рашаючага значэння па шырыні і глыбіні перамен. Змены ахопліваюць усе сферы быцця чалавека, а таксама літаратуру і мастацтва, дзе адбываюцца працэсы жанравага зрушэння.

Адзін са спосабаў філасофскага пераасэнсавання рэчаіснасці і ацэнкі свайго ўласнага жыцця прапаноўвае раман-прытча – новая жанравая мадыфікацыя сучаснага рамана. Тыпалагічнымі рысамі рамана-прытчы з'яўляюцца ўніверсальнасць, філасофскае абагульненне зместу, наяўнасць падтэксту і алюзій на сучасныя сацыяльныя, палітычныя і культурныя праблемы; а таксама двухпланавасць кампазіцыі і сістэмы персанажаў, выкліканыя ўзаемаўплывам дзвюх празаічных жанраў (рамана і прытчы, або аповесці і прытчы), канцэнтраванасць прасторава-часавага ўспрымання свету, абумоўленае сусветнай значнасцю закранутых пытанняў.

Выдатнейшыя пісьменнікі розных краін звярталіся да рамана-прытчы для вырашэння мастацкіх задач. Сярод іх: А. Камю, Ж.-П. Сартр, Б. Брэхт, Ф. Кафка, У. Голдынг, П. Зюскінд, У. Фолкнер, Гарсія Маркес, Л. Талстой, Л. Андрэеў, Ул. Маканін, В. Быкаў, Ул. Караткевіч, Ул. Арлоў, Ул. Жук, Т. Бондар, Я. Сіпакоў, Ф. Сіўко і іншыя.

У беларускай сучаснай літаратуры таксама адзначаецца пільная ўвага да прытчы і рамана-прытчы як жанравай мадыфікацыі сучаснага рамана. Безумоўна, перш за ўсё гэта выклікана агульнасцю як філасофска-сацыяльнага колаў праблем, так і магчымасцю абагуленасці аповеду. Беларускія

Полесгу

аповесці-прытчы і іншыя мадыфікацыі лагічна ўкладаюцца ў сучасны заходнееўрапейскі літаратурны працэс. У беларускім рамане-прытчы чалавек і свет, свядомасць і быццё ўвесь час знаходзяцца ва ўзаемадзеянні. Адна з галоўных праблем у прытчавым творы – супярэчлівы феномен самотнага чалавека.

Мэта дадзенага даследавання – выявіць спецыфіку феномена самотнага чалавека у сучасным прытчавым творы на прыкладзе беларускай і французскай літаратуры.

Традыцыйна самотны стан разглядаецца або з пункту гледжання ўнутранага свету адзінокага чалавека, або з пункту гледжання яго сацыяльнага асяроддзя. Найвялікшая колькасць даследаванняў па праблеме адзіноты праводзіцца ў рамках псіхалогіі і сацыялогіі. Згодна абедзвюм навукам, ‘адзінота’ мае адначасова і асобасны і сацыяльны характар. Прычыны яе ўзнікнення – суб’ектыўныя і аб’ектыўныя, гэта значыць, падкантрольныя чалавеку, якія ён можа прадухіліць, і непадкантрольныя яму – тыя, што не залежаць ад дзеянняў аднаго пэўнага чалавека. Па сцвярджэнню Ж. Пузанавай, «суб’ектыўныя і аб’ектыўныя прычыны – узаемазвязаныя і ўзаемаабумоўленыя, іх размежаванне – ўмоўнае» [5, с. 48].

У філасофіі праблема вывучэння феномена адзіноты залежыла ад пэўных гістарычных умоў. Праблема адзіноты найбольш грунтоўна распрацавана ў фенаменалагічным і экзістэнцыяльным падыходах. З пункту гледжання фенаменалогіі, жыццёвы свет чалавека – адкрытая дынамічная сістэма, якая не толькі звязваецца з феноменамі, якія знаходзяцца за яе межамі, але і выбудоўвае адносна трывалы ланцужок узаемадзеяння суб’ектыўных асаблівасцяў дадзенай сістэмы. Адзінота ўносіць разлад у жыццёвы свет чалавека, аказвае істотны ўплыў на характар суб'ектыўных перажыванняў. В. Садлер вылучае тры аспекты жыццёвага свету чалавека: унікальнасць жыццёвага шляху кожнага чалавека, культурная прастора асобы, вонкавае асяроддзе [6, с. 182]. Адзінота, як вынік сур’ёзных няшчасцяў у адным з гэтых аспектах жыццёвага свету чалавека, становіцца своасаблівай «праверкай на трываласць», бо сама адзінота не можа прывесці ні да дэградацыі, ні да смерці.

Такім чынам, у фенаменалогіі адзіноцтва – гэта комплексная з’ява, вытокі якога – адначасова ўнутры і па-за межамі пэўнай сэстэмы.

У філасофіі экзістэнцыйналізму не вывучаюцца ні прычыны ўзнікнення адзіноты, ні фактары, што спрыяюць развіццю і ўзмацненню гэтага пачуцця. Згодна падыходу, адзінота – гэта жыццёвы вопыт, гэта само жыц-



Полесгу

цё, гэта спрадвечна зададзеная ўмова чалавечага быцця, якую немагчыма скасаваць, ні аспрэчыць, але якое можна прадуктыўна скарыстаць. Як сцвярджаюць экзістэнцыялісты, хаця адзінота і суправаджаецца рознымі негатыўнымі перажываннямі, аднак яна падахвочвае чалавека да творчай працы, да творчага дачынення да рэальнасці ў цэлым і да сацыяльнага асяроддзя ў прыватнасці.

Як сцвярджае Ж. Пузанава, «не адзінота, а ўцёкі ад адзіноты робяць чалавека няшчасным, незадаволеным, слабым» [5, с. 55]. У гэтым экзістэнцыяльны падыход пераклікаецца з фенаменалагічным: праблема адзіноты цесна звязана з праблемай усвядомленасці.

Неабходна таксама адзначыць, што ў рускамоўных працах класікаў філасофіі ёсць свае ўласныя ўнікальныя пагляды на праблему адзіноцтва, якія асвятляюць прынцыпова іншыя аспекты адзіноты. Рускія філосафы і, у прыватнасці, М. Лоскі [4], больш дэталёва аналізуюць такі складнік феномена адзіноты як Боскі пачатак.

Згодна з рускай філасофіяй, адзіноцтва – гэта феномен ўзаемадзеяння ў сістэме «Бог – чалавек»: адзінота – не вынік уплыву вонкавых фактараў, не зададзены параметр чалавечага быцця, а стан, які фарміруецца ў выніку неўсвядомленага ці наўмыснага разрыву сувязі чалавечага «я» з Богам. Ініцыятарам такога разрыву заўсёды выступае чалавек.

Як сцвярджае М. Бярдзяеў, «чалавек, які ізалюецца ад Бога, не мае духоўнага жыцця і таму непазбежна перажывае пачуццё адзіноты, прычыны якога ён бачыць у сабе, іншых людзях ці навакольным асяроддзі» [1, с. 99].

У сваю чаргу В. Нясмелаў пісаў, што «адзінота ўзнікае пры адсутнасці чалавечага «я» і Бога» [2, с. 99]. Ступень гэтага адзінства, як і яго адсутнасць, вызначаецца самім чалавекам, якому першапачаткова дадзена такая магчымасць. Пазбавіцца ад адзіноты і ўнутраных пакут можна толькі ў працэсе з'яднання з Боскім пачаткам.

Сур'ёзная праблема самотнага чалавека ў сучасным грамадстве прадстаўлена ў прытчавых творах беларускай пісьменніцы Т. Бондар і французскага аўтара М. Турнье. Нягледзячы на розніцу мастацкіх поглядаў і эстэтычных праграм іх імёны могуць знаходзіцца побач па прычыне пэўных фактараў, сярод якіх наступныя:

– прыналежнасць дадзеных аўтараў да пэўнага перыяду развіцця культуры і літаратуры; актуальнасць і навізна іх творчасці;

– шырокая распаўсюджанасць жанру рамана-прытчы ў іх творчасці;

– засяроджанасць на філасофска-сацыяльных праблемах нашага часу,

Полесгу

відавочная абагуленасць і ўніверсальнасць аповеду ў творах;

– асэнсаванне феномену самотнага чалавека ў сучасным грамадстве ролі і вастрыня праблем, звязаных з ім;

– адлюстраванне калізій свету і трагічнага, апакаліптычнага, светаадчуванні праз рэфлексіўнае ўспрыманне свету чалавекам;

– арыгінальны спосаб аўтарскага пераасэнсавання, перапрацоўкі матэрыялу, уплыў уласнага вопыту, уздзеянне падсвядомасці і тыя ці іншыя адрозненні менталітэту.

Так, у творчасці сучаснай беларускай пісьменніцы Т. Бондар вельмі выразна ставіцца праблема самотнага чалавека ў сучасным грамадстве. Аўтар прытрымліваецца высноў рускіх філосафаў і звязвае адзіноту чалавека з яго разладам з Богам.

У прыватнасці, у рамане-прытчы Т. Бондар «Павуцінне» (2004) галоўная гераіня, сучасная пісьменніца Анэля, адчувае адзіноту, адсутнасць сапраўднай чалавечай блізкасці. У пошуку свайго ўласнага творчага шляху жанчына трапляе на пуцявіну, якая вядзе і прыводзіць яе ў часы Ісуса Хрыста. Такім чынам, адначасова ў рамане апавядаецца пра падзенне, адзіноту і духоўнае ачышчэнне біблейскага персанажа – Марыі Магдалены.

Перад чытачом паўстае асоба ў драматычна-напружаным стане: твор пачынаецца з таго, што галоўная гераіня, ахвяруючы сваім жыццём, выратоўвае малое дзіця, якое амаль не патрапіла пад колы яе аўтамабіля. Такім чынам, усё, пра што будзе ісці гаворка ў рамане, падаецца Анэляй у момант яе «прасвятлення» і набывае эмацыянальную, суб'ектыўную афарбоўку.

У рамане-прытчы паказаны не характар, а стан персанажа, які апынуўся ў цяжкай для яго сітуацыі, выкліканай непрыемным сутыкненнем з рэчаіснасцю: «… зліваліся радасць і глухая, адчайная безнадзейнасць, тужлівая скруха і вясёлы жыватворны дзіцячы смех, няўцешны плач па страчаным і звонкія птушыныя спевы… » [3, с. 5] Т. Бондар перадае самымі рознымі сродкамі боль, адчай, непакой сваёй гераіні і сама ўнутрана зліта з ёй ў адзінае цэлае: «Цішыня расколвалася, асыпалася вакол і ўнутры, у душы, калючымі сколкамі, ранячы, змушаючы ўспомніць, што апакаліпсіс – гэта апакаліпсіс кожнай такой хвіліны, а яна ні словам, ні зрухам не баранілася» [3, с. 4].

Аўтар паказвае, што прычына адзіноты Анэлі – не прырода чалавека, не «кашмарнае» быццё, а пэўныя пачварныя нормы і крытэрыі чалавечага жыцця: «Бедныя, неразумныя дзеці! Грубы, груба ўведзены ў штодзённае карыстанне матэрыялізм за адно стагоддзе агаліў, спустошыў іх слабыя



ПолесГУ

душы, зло, калі і не апраўданае, дык прызнанае як сіла ўсімі ідэалогіямі, раз'ядае рэштку...» [3, с. 41] Пісьменніца ўсклікае: «Перакошаная шалёнаю злосцю морда маладога дэбіла – твар чалавецтва? » [3, с. 41]

Т. Бондар, вуснамі сваёй гераіні, спрабуе адказаць на спрадвечнае пытанне: які жыццёвы шлях павінен абраць чалавек — шлях лягчэйшы, але не заўсёды сумленны, або цяжэйшы, але верны? У адной з дыскусій з чытачамі Анэля адказвае на гэтае пытанне такім чынам: «Скрозь жа выбіраем лягчэйшы шлях, а лягчэйшы — гэта ўніз, гэта падзенне, а не пад'ём, і як, якімі словамі пераканаць сябе ці каго іншага ў неабходнасці зрабіць намаганне, рабіць новыя і новыя намаганні, каб спыніцца, зірнуць у гору, паспрабаваць перамагчы слабасць у нагах, слабасць у душы – задача не з простых» [3, с. 50].

У творы вобраз Анэлі прыпадабняецца да вобразу Ісуса, бо прыход Ісуса звязаны з намерам уратаваць свет («…не паслаў Бог Сына свайго ў свет, каб судзіць свет, але каб свет уратаваны быў праз яго...» [3, с. 154]) – гэтым жа намерам прадыктавана і жаданне жанчыны напісаць кнігу.

Гераіня намагаецца выратаваць сваю душу ад цемры: «Трэба было нешта рабіць, неяк ратавацца, каб не даць абрынуць сябе ў цёмны хаос, у вечны морак, дзе ўсё ператвараецца ва ўсё і ад холаду, ад усёпранізлівага смяротнага холаду, патрапіўшы ў яго абдымкі, гіне любая чалавечая душа» [3, с. 4].

У той жа час сама гераіня гаворыць аб адсутнасці трывалай веры ў сваёй душы. Яна чуе «ўнутраны голас», да яе раптам прыходзяць успаміны або сны. Часам, словы, прамоўленыя Анэляй, з'яўляюцца не яе ўласнымі, а нібыта чужымі, — так, напрыклад, яна нечакана для самой сябе вымавіла на сустрэчы з чытачамі назву будучай кнігі – «Страсці па Марыі». Разуменне ў Анэлі яшчэ не пераходзіць у дзеянне, у адрозненне ад Марыі Магдаліны, якая разам з верай набывае і любоў — галоўную каштоўнасць.

Менавіта ў момант малітвы Анэля больш не адчувае сябе адзінокай і прыходзіць да гатоўнасці быць паслухмянай Божым, а не чалавечым загадам. Гераіня адмаўляецца пісаць другасортныя кніжкі, якія дагаджалі б густам масы, і выбірае жыццё у адпаведнасці з хрысціянскімі каштоўнасцямі.

У канцы рамана Анэля быццам «ператвараецца» ў сваю гераіню і прымае на сябе яе лёс. «Разам з ёю ты пройдзеш яе пакутным шляхам, праз боль, праз радасць дачынення да тых вялікіх падзей спасцігаючы, што дух, каб расці, павінен змагацца, увесь час супрацьстаяць галасам, нашэптван-

Полесгу

ням — спакусам, якія, як іржа, раз'ядаюць яго,» – кажа ёй Даніла [3, с. 128].

Біблейскі матэрыял спатрэбіўся пісьменніку для таго, каб падштурхнуць чытача – сучаснага чалавека – вырвацца з шэрай паўсядзённасці, адзіноцтва, адчужанасці. Адзіны выхад для разбітага, стомленага, маральна няўстойлівага чалавека XX стагоддзя пісьменнік бачыць у вяртанні да духоўных вытокаў.

Падобна Т. Бондар, французскі пісьменнік М. Турнье ў сваім творы «Элеазар, альбо Крыніца і Куст» («Eléazar ou La Source et Le Buisson», 1996) таксама выратоўвае свайго героя Элеазара ад адзіноты ў сучасным грамадстве, адправіўшы яго ў сакральнае падарожжа да новага жыцця з Богам у душы. Аўтар, абапіраючыся на біблейскі матэрыял, стварае алюзію на сучасны свет: яго амаральнасць, нестабільнасць, тэрарызм, заняпад культуры, экалагічныя і іншыя бедствы.

Саракадзённы марскі пераход Элеазара адпавядае саракагадоваму знаходжанню Майсея ў пустыні, калі ён пасвіў авечак і пазнаваў духоўныя ісціны. У Свяшчэнным Пісанні Майсей узмацняецца ў сваёй веры, у той час як у кнізе французскага раманіста герой паглыбляецца ў «агідную клааку»: «кубрык, адведзены для мужчын, уяўляў сабой сапраўдане пекла, бітком напханае грэшнікамі» [7, с. 51].

М. Турнье перайначвае міфалагічны матэрыял, ствараючы своеасаблівую антытэзу: карабель з грэшнымі людзьмі супрацьпастаўляецца свяшчэннаму месцу – пустыні, дзе Майсей знаходзіўся сам-на-сам з Богам. Элеазар разглядае падарожжа як «урок, што будзе асвячаць яго веру». «Нездарма ж лічыцца, – разважае ён, – што падарожжы прасвятляюць, – дык і на самой справе кожны іх [падарожжаў] этап нясе чалавеку новыя адкрыцці!» [7, с. 55].

Як і яго рэлігійны настаўнік, Элеазар духоўна расце. Ягоны характар дапаўняецца такімі рысамі, як мудрасць, лагоднасць, чуйнасць, клапатлівасць, цярплівасць, якія будуць яму неабходныя, каб настаўляць іншых людзей, каб стаць сапраўдным правадыром для сваёй сям'і.

Напрацягу ўсяго рамана-прытчы герой, падобна вялікаму прароку Майсею, шукае ісціну. Шлях Элеазара да Зямлі Абяцанай сімвалізуе ў творы французскага раманіста М. Турнье універсальны шлях кожнага чалавека да свабоды. Сапраўднай – унутранай і знешняй – свабоды можна дасягнуць толькі тады, калі боскія Запаветы стануць для кожнага чалавека і ўсяго народа ў цэлым не чым-небудзь знешнім, а законам сэрца. Шлях праз пустыню галоўнага героя рамана М. Турнье тлумачыцца як пераадо-



Полесгу

ленне адзіноты, ўнутранай цемры ў чалавечай душы, як шлях яднання з Богам.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што пісьменнікі ў сваіх прытчавых творах бачаць прычыну адзіноты асобы не ў яго прыродзе, а ў канкрэтных, склаўшыхся ў сучасным грамадстве пачварных нормах і прынцыпах жыцця. Адзінокае існаванне чалавека ў рамане-прытчы – гэта выбух безнадзейнасці, выкліканы вострым адчуваннем таго, што няма больш нічога каштоўнага ў «цывілізаваным» грамадстве, гэта крык жаху, болю і адначасова абурэння. Абодва пісьменніка – і Т. Бондар і М. Турнье – бачаць адзіны выхад для самотнага чалавека XXI стагоддзя ў вяртанні да духоўных вытокаў.

1. Бердяев, Н.А. Дух и реальность / Н. А. Бердяев. – М.: Изд-во АСТ, 2007. – 381 с.
2. Белгородский, М. Н. Человек и Бог в философии Несмелова / М. Н. Белгородский // Несмелов В. И. Вера и знание с точки зрения гносеологии. – М.: Наука, 1992. – С. 3 – 22.
3. Бондар, Т. Павуцінне: раман-містэрыя / Т. Бондар. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2004. – 223 с.
4. Лосский, Н.О. История русской философии / Н. О. Лосский. – М.: Прогресс, 1994. – 460 с
5. Пузанова, Ж.В. Философия одиночества и одиночество философа / Ж. В. Пузанова // Вестник РУДН. Сер. Социология. – 2003. – № 4–5. – С. 47–58.
6. Садлер, У., Джонсон Т. От одиночества – к аномии. Лабиринты одиночества: Пер. с англ. / Сост., общ. ред. и предисл. Н.Е. Покровского / У. Садлер, Т. Джонсон. – М.: Прогресс, 1989. – 624 с.
7. Турнье, М. Элеазар или Источник и Куст / М. Турнье. – Санкт-Петербург: Амфора, 2001. – 214 с.

Полесгу